**Масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК “Лунінецкая РЦБС” у лютым**

**1 лютага. ЦБ.** Адбылася інфармацыйная сустрэча супрацоўнікаў раённай бібліятэкі з адвакатамі юрыдычнай кансультацыі Лунінінецкага раёна Тамарай Аляксееўнай Грыцкевіч і Наталлей Іванаўнай Чухліб на тэму “Выбары 2024 года”. У ходзе сустрэчы адвакаты пазнаёмілі прысутных з навінамі маючай адбыцца выбарчай кампаніі. Сярод іх – адмова ад утварэння ўчасткаў для галасавання за мяжой; забарона вылучэння на выбарныя пасады асоб, у якіх маецца Грамадзянства замежнага дакумента альбо дакумент, які прадстаўляе права на льготы і перавагі ў сувязі з палітычнымі, рэлігійнымі поглядамі або нацыянальнай прыналежнасцю (напрыклад, «карта паляка»); забарона на вынас выдадзенага бюлетэня за межы памяшкання для галасавання, а таксама ажыццяўленне фота - і відэаздымкі запоўненага бюлетэня і інш. У завяршэнне сустрэчы Тамара Аляксееўна і Наталля Іванаўна адказалі на пытанні.

Да **Дня юнага героя-антыфашыста** ў бібліятэках прайшлі патрыятычныя мерапрыемствы, былі аформлены тэматычныя кніжныя выставы.

**8 лютага**. **Мікашэвіцкая гарадская бібліятэка** для вучняў 5-х класаў СШ №2 і СШ №1 прайшла гадзіна памяці “Украденное детство”. Бібліятэкары расказалі дзецям пра юных абаронцах Радзімы. У **Бродніцкай сельскай бібліятэцы-клубе** адбылася гадзіна патрыятызму “Прайшла праз дзяцінства вайна”, у **Міжлескай сельскай бібліятэцы** для вучняў 4 класа правялі літаратурна-пазнавальную гадзіну “Маленькие герои большой войны”.

**9 лютага. ЦБ.** У духоўна-асветніцкім цэнтры “Истоки” прайшла духоўна-асветніцкая гутарка “Ксения Петербургская. Подвиг во имя любви”, прысвечаная памяці святой блажэннай Ксеніі Пецярбургскай. На мерапрыемства запрасілі настаяцеля храма іконы Божай Маці (в.Рэдзігерава), іерэя Аляксандра Барысава. Айцец Аляксандр распавёў пра зямное жыццё св. блажэннай Ксеніі, пра яе малітоўную дапамогу. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэа “Житие святой Блаженной Ксении Петербургской".

Напрыканцы гутаркі прайшла віктарына, дзе ўсе ўважлівыя атрымалі салодкія прызы ад святара.

Прайшлі мерапрыемствы **да 130-годдзя** з дня нараджээння рускага пісьменніка **Віталя Біянкі**.

**11 лютага** супрацоўнікі **ЦДБ** арганізавалі калейдаскоп цікавых навін “Про зелёные леса…” ў **Дрэбскай сельскай біблятэцы-клубе** для вучняў малодшых класаў арганізавалі слайд-падарожжа “Лесные полянки Виталия Бианки”, у **Рэдзігераўскай с.б.** – літаратурная гадзіна “Па старонках кніг Віталя Біянкі”, у **Вулькаўскай-1** і **Вулькаўскай-2** сельскіх бібліятэках – гульня-падарожжа і красворд-гульня “Лесной кудесник”, у **Міжлескай с.б.** – гадзіна-пазнанне “Чарующий мир Бианки” і інш.

Прайшлі мерапрыемствы прысвячаныя **Дню воінаў-інтэрнацыяналістаў.**

**13 лютага. Мікашевічская г.б.** Супрацоўнікі бібліятэкі арганізавалі для вучняў 7» Б " класа СШ №1 ім. А. Зайчанка маршрут памяці " Слава Табе, пераможца салдат!». Дзеці наведалі мемарыяльны комплекс-помнік загінулым воінам-афганцам Лунінецкага раёна, ушанавалі памяць загінуўшых і ўсклалі кветкі. Бібліятэкары расказалі дзецям пра нашых землякоў, якія не вярнуліся са службы ў Афганістане. А ў сценах бібліятэкі **15 лютага** для вучняў 9 "А" класа СШ № 2 прайшоў урок мужнасці «Час выбраў вас!».
**14 лютага. У Мікашэвіцкай гарадской бібліятэцы** Адбылася сустрэча з удзельнікамі баявых дзеянняў "Пока мы помним мы живём". Перад вучнямі 8 "А" класа СШ №3 выступілі Аляксандр Андрэевіч Жуланаў і Іван Іванавіч Наварыч.
**15 лютага. ЦБ.** Прайшоў вечар ваеннай паэзіі "Никто в забвенье не уходит". Перад вучнямі 11 "Б" класа СШ №2 выступілі воіны-інтэрнацыяналісты Сяргей Васільевіч Барысевіч і Аляксандр Андрэевіч Жуланаў. Яны распавялі школьнікам аб мужнасці і адвазе воінаў, аб цяжкіх умовах, у якіх даводзілася ваяваць. Удзельнікі мерапрыемства мелі магчымасць задаць пытанні пра вайну і паглядзелі відэапрэзентацыю "Мы исполнили свой долг" пра ўраджэнцаў Лунінеччыны, якія загінулі ў Афганістане.
**15 лютага.** Загадчык **Дрэбскай сельскай бібліятэкай-клубам** наведала на даму бацьку салдата, які загінуў у Афганістане Паўла Кавалевіча, Івана Паўлавіча і воіна-інтэрнацыяналіста Васіля Адамавіча Арэшкевіча. Супрацоўнік **Краснавольскай** сельскай бібліятэкі таксама наведала воіна-інтэрнацыяналіста Вячаслава Раманавіча Нагорнага. Бібліятэкары выказалі ім словы падзякі і ўручылі памятныя падарункі.
Загадчык **Сітніцкай сельскай бібліятэкай-клубам** разам з дзецьмі наведалі магілу воіна-інтэрнацыяналіста, ураджэнца в.Сітніца, Аляксандра Іванавіча Трухановіча. Ушанавалі памяць загінулага хвілінай маўчання і ўсклалі кветкі. Затым наведалі маці Аляксандра, Марыю Аляксандраўну. Яна распавяла дзецям пра дзяцінства і юнацтва свайго сына і пра боль, якую пранесла праз усё сваё жыццё пасля весткі аб яго смерці. Школьнікі падарылі падарункі і пажадалі Марыі Аляксандраўне моцнага здароўя.

Прайшлі мерапрыемствы да **Дня роднай мовы**.

**20 лютага. Мікашэвіцкая г.б.** Для вучняў 5 "А" класа СШ №2 правялі конкурсна-пазнавальную праграму "Мая мова – беларуская". Гульня складалася з прыпынкаў. Першы прыпынак "Загадкі". Вучні адгадвалі загадкі пра мову. На наступным прыпынку "Перакладчыкі" вучні перакладалі словы з рускай мовы на беларускую. На прыпынку "Чым і кім славіцца родны край?" школьнікі апавядалі пра знакамітых гістарычных асоб, пісьменнікаў. Апошнім прыпынкам гульні быў конкурс "Старонкі мінулага і сучаснага". Да мерапрыемства была аформлена кніжная выстава "Адкрый для сябе беларускую кнігу".
А для вучняў старэйшых класаў прайшла літаратурная гадзіна "Зямлі маёй роднае слова". Прысутныя даведаліся аб гісторыі ўзнікнення Міжнароднага дня роднай мовы. Дзеці чыталі вершы, складалі прыказкі, з дапамогай

слоўнікаў перакладалі словы. Падчас сустрэчы удзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з кніжнай выставай твораў беларускіх аўтараў.

**21 лютага. ЦДБ.** Гадзіну паэзіі "Мова – душа народа" правялі для вучняў 3 класа СШ №1. Бібліятэкар расказала, што для кожнага чалавека важна ведаць родную мову, ганарыцца сваім паходжаннем і прыналежнасцю да свайго народа. Распавяла пра паэтаў, якія праславілі беларускую мову. Дзеці перакладалі словы, разгадвалі загадкі, тлумачылі сэнс фразеалагізмаў.

Прайшлі мерапрыемствы і ў сельскіх бібліятэках. Так, ў **Дрэбскай сельскай бібліятэцы-клубе** прайшоў Дзень роднай мовы "Зямлі маёй родная мова", у **Любачынскай сельскай бібліятэцы** правялі свята роднай мовы "Рускай мове дай разгрузку, размаўляй па-беларуску" і інш.

**21 лютага. ЦБ.** Адбылася чарговае пасяджэнне народнай літаратурна-паэтычнай студыі "Литературная провинция". На сустрэчу запрасілі пісьменніцу Ніну Енбулаеву (г.Пінск), якая адзначыла свой 75-гадовы юбілей. Яна пазнаёміла ўдзельнікаў мерапрыемства са сваёй творчасцю, распавяла пра тое, чаму стала пісьменніцай і ці цяжка гэта складаць вершы і апавяданні для дзяцей і дарослых, якая яе любімая кніга. Падчас мерапрыемства быў прэзентаваны зборнік вершаў "Сонечны зайчык".

**Да адзінага дня галасавання ў Беларусі** ў бібліятэках ДУК «Лунінецкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» афармлены кніжныя выставы і куткі выбаршчыка, праводзіліся мерапрыемствы пазнавальнага характару. Супрацоўнікамі Публічнага цэнтра прававой інфармацыі падрыхтовалі да мерапрыемстваў інфармацыйныя памяткі і буклеты па тэме выбараў "Выборы – завтра начинается сегодня", "Выборы: от подготовки до проведения".

**7 лютага** ў Кажан-Гарадоцкай сельскай бібліятэцы-клубе адбылася сустрэча з кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па Лунінецкай выбарчай акрузе Эдуардам Мікалаевічам Севярынам. У ходзе мерапрыемства Эдуард Мікалаевіч расказаў пра сваю дзейнасць і агучыў тэзісы перадвыбарнай праграмы.

**21 лютага. ЦБ.** Прайшла для школьнікаў прававая гульня "Што такое выбары?». Бібліятэкар у гульнявой форме пазнаёміла навучэнцаў з прынцыпамі і задачамі правядзення выбараў. Дзеці даведаліся аб значэнні паняццяў: "перадвыбарная праграма", "бюлетэнь", "урна", "кабінка для галасавання", "кандыдат". Для замацавання ведаў для дзяцей правялі невялікую віктарыну.

**22 лютага. ЦБ.** З мэтай павышэння прававой культуры маладых людзей і будучых выбаршчыкаў прайшоў урок прававой пісьменнасці "Твой выбар – твая будучыня". На сустрэчу з моладдзю была запрошана адвакат юрыдычнай канторы Наталля Іванаўна Чухліб, якая азнаёміла прысутных з заканадаўствам у сферы выбарчага права. Галоўны бібліёграф азнаёміла ўдзельнікаў сустрэчы з прававой сістэмай "Эталон", пракансультавала, як знайсці патрэбны дакумент у сферы канстытуцыйнага і выбарчага права.

А для прадстаўнікоў старэйшага пакалення галоўны бібліёграф правяла бібліяграфічны агляд па кніжнай выставе "25 лютага – Адзіны дзень галасавання”.
**23 лютага.** Бібліятэкар бібліёбуса цэнтральнай раённай бібліятэкі падчас паездкі па маршруце Сітніцкі Двор-Лахоўка-Боркі правяла з чытачамі гутарку «Адзіны дзень галасавання».
Прайшлі мерапрыемствы да **Дня абаронцаў Айчыны і Узброенных Сіл Рэспублікі Беларусь**
**21 лютага. Мікашэвіцкая г.б.** Прайшла тэматычная гадзіна “Новые защитники нового века”. Удзельнікі мерапрыемства, члены клуба “САМИ”, пазнаёміліся з гісторыей свята, ўдзельнічалі ў “ваеннай” віктарыне, успаміналі прыказкі і прымаўкі патрыятычнай тэматыкі.
Для вучняў 7 класа правялі конкурсна-гульнявую праграмму “А ну-ка, мальчики!”. Прысутныя даведаліся пра гісторыю свята, пазнаёміліся з ваеннымі спецыяльнасцямі, паўдзельнічалі ў конкурснай праграме.
**23 лютага. ЦДБ.** Прайшла гадзіна мужнасці “Подвигу лежит дорога в вечность”. А ў **ЦБ** прайшоў урок мужнасці “Отвага, мужество и гордость”.